**Т. М. Агеенка**

# ДАКУМЕНТЫ ГЕРМАНСКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАДАЎ ЯК БІЯГРАФІЧНЫЯ КРЫНІЦЫ

Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны да гэтага часу выклікае вялікую цікавасць і не губляе сваёй актуальнасці сярод навукоўцаў і генеалаў, якія ў пошуках неабходных крыніц звяртаюцца ў архівы. Найбуйнейшым сховішчам дакументаў перыяду вайны на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Тут прадстаўлены матэрыялы партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі. На гэтай аснове былі створаны картатэкі ўдзельнікаў партызанскага руху (у тым ліку падпольшчыкаў і сувязных), а таксама ўзнагароджаных. Варта адзначыць, што на працягу некалькіх гадоў Нацыянальным архівам сумесна з выдавецкім домам "Беларусь сегодня" праводзіцца праца па алічбаванні дакументаў Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) і прадстаўленні іх на сайце "Партызаны Беларусі" (partizany.by). Асноўны комплекс змешчаных на сайце крыніц складаюць асабістыя лісткі і ўзнагародныя дакументы на радавы і камандны склад. Дзякуючы базе дадзеных "Германская неволя" можна праверыць, ці ёсць у архіве звесткі аб родных, якія апынуліся на прымусовых працах у краінах Заходняй Еўропы пад час вайны. Для палягчэння пошуку звестак аб грамадзянскім насельніцтве, якое пражывала на акупаванай тэрыторыі Беларусі, супрацоўнікі архіва распрацавалі пералік дакументаў "Грамадзянскае насельніцтва ў гады акупацыі на тэрыторыі Беларусі". Аснову гэтых баз, картатэк, пералікаў складаюць дакументы партызанскіх брыгад і атрадаў, БШПР. У той жа час амаль не выкарыстоўваюцца дакументы германскіх акупацыйных устаноў. Адзначым, што частка насельніцтва супрацоўнічала з акупацыйнымі ўладамі, частка была вымушана кантактаваць з уладамі для вырашэння тых ці іншых пытанняў, акрамя таго, у акупацыйных установах працавалі замежныя спецыялісты. Такім чынам, зварот да гэтых матэрыялаў можа спрыяць выяўленню і ўвядзенню ў навуковы ўжытак новых, раней невядомых крыніц біяграфічнага характару.

Дакументы нямецкіх акупацыйных уладаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны можна падзяліць на некалькі груп:

- вышэйшыя органы ўпраўлення акупаванымі тэрыторыямі;
- мясцовыя органы акупацыйнай адміністрацыі і органы самакіравання;
- цэнтральныя органы самакіравання і іх рэгіянальныя аддзяленні;
- воінскія ўстановы, часці, фарміраванні;
- паліцыя і фарміраванні, якія выконвалі паліцэйскія функцыі;
- органы судовай улады і адвакатуры;
- органы і арганізацыі па мабілізацыі і выкарыстанні працоўнай сілы, фінансавання і крэдытавання прамысловасці, сельскай і лясной гаспадаркі, будаўніцтва, транспарта, сувязі, гандлю, адукацыі, культуры і мастацтва, друку і выдавецкай справы;

• грамадскія аб’яднанні і фарміраванні, якія легальна функцыянавалі ва ўмовах акупацыі.

Усяго яны складаюць 72 фонда. Акрамя таго, у архіўным фондзе БШПР захоўваюцца дакументы некаторых упраў. Інфарматыўнасць і ўзровень іх захаванасці розныя, большасць напісана на нямецкай мове.

Дакументы нямецкіх акупацыйных устаноў, у якіх знайшлі адлюстраванне звесткі біяграфічнага характару, можна падзяліць на некалькі тэматычных блокаў. Вялікую частку складаюць матэрыялы аб супрацоўніках вышэйшых і мясцовых органаў акупацыйнай адміністрацыі: асабістыя справы, асабістыя карткі, працоўныя кніжкі, анкеты, спісы супрацоўнікаў Генеральнага камісарыяту Беларусі (ГКБ), акруговых камісарыятаў і акупацыйных устаноў; распараджэнні ГКБ аб прыёме на працу асоб нямецкай нацыянальнасці і мясцовага насельніцтва; спісы, характарыстыкі, аўтабіяграфіі служачых ГКБ (тут можна знайсці дакументы за 1920–1930-я гг.) і падначаленых яму ўстаноў. У перапісцы аб прызначэнні (зняцці, перамяшчэнні) немцаў на розныя пасады захоўваюцца анкеты, аўтабіяграфіі, характарыстыкі і інш.

Фінансавы блок складаюць ведамасці на выдачу заробку, патрабаванні нямецкіх служачых на выплату часткі заробку родным, якія пражывалі на тэрыторыі занятых усходніх абласцей; спісы польскіх рабочых будаўнічага лагера ў Мінску, рабочых, якія працавалі на прадпрыемствах горада і інш.; заявы нямецкіх служачых на атрыманне пад’ёмных пры пераводзе іх з Германіі ў Генеральную акругу Беларусь. Частка дакументаў прадстаўлена асабістай перапіскай супрацоўнікаў ГКБ, кіраўніка апякунскага савета ГКБ Х. Гербста, заявамі і анкетамі асоб для атрымання дазволу на выезд родных служачых ГКБ і акруговых камісарыятаў з Германіі на тэрыторыю занятых усходніх абласцей, спісы жонак служачых акупацыйных устаноў Беларусі, якія вярталіся з дзецьмі ў Германію.

Сярод матэрыялаў аб прадстаўленні да ўзнагароджання: звесткі аб служачых Мінскага гарадскога камісарыяту, спісы ваеннаслужачых супрацоўнікаў ГКБ і падначаленых яму ўстаноў, пасведчанні асоб. Таксама захаваліся спісы служачых, якія былі ў 1942–1943 гг. узнагароджаны значком за раненне.

Звесткі аб службе ў нямецкіх узброеных фарміраваннях прадстаўлены характарыстыкамі, анкетамі, спісамі кіруючага складу баявога добраахвотніцкага батальёна імя Буглая, казачых калон, асабовага складу батальёна Рускай вызваленчай арміі, кіраўнікоў Беластоцкага філіяла Украінскага нацыянальнага аб’яднання, салдат і афіцэраў 1-й коннай роты 308 усходняга батальёна, асабістымі карткамі, спісамі ваеннаабавязаных імперскіх немцаў, вольнанаёмных нямецкіх служачых, якіх пераводзілі на вайсковую службу, зондэрфюрэраў 1892–1905 гг. нар., ваеннаабавязаных запаса, якія годныя да службы ў ваенны час (складзенымі нямецкай клінікай у г. Мінску), ваеннаслужачых 1-га і 2-га ўзводаў зенітнай артылерыі, якія ахоўвалі генеральны камісарыят Беларусі, добраахвотнікаў 2-га транспартнага батальёна 36 пяхотнай дывізіі.

Значную колькасць складаюць дакументы адукацыйнага характару. Матэрыялы аб выкладчыках, настаўніках, студэнтах і вучнях прадстаўлены спісамі тых, што засталіся ў г. Мінску, сельскагаспадарчых школ Беларусі, Беларускага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута імя С. Міхайлава, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, Мінскай беларускай прагімназіі; анкетамі, аўтабіяграфіяміі, спісамі выкладчыкаў і студэнтаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, студэнтаў 4–5 курсаў медыцынскага інстытута ў г. Вільна, студэнтаў-медыкаў, якія навучаліся да Вялікай Айчыннай вайны ў Мінскім медыцынскім інстытуце і якія пражывалі на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь, выкладчыкаў медыцынскага, гандлёвага, мастацкага вучылішч і вучылішча кіравання ў г. Баранавічы, акруговых і раённых інспектараў школ Баранавіцкай і Слонімскай акруг, заснавальнікаў беларускай настаўніцкай семінарыі, настаўнікаў Навагрудскай настаўніцкай семінарыі; спісамі вучняў, якія прымалі ўдзел у аднаўленні школ г. Мінска, вучняў школы в. Клебаны Радашковіцкага раёна, кандыдатаў у сельскагаспадарчую школу ў м. Лучае і інш.

Невялікую групу складаюць матэрыялы аб дзеячах культуры і навукі. Сярод іх: анкеты музыкаў з ліку мясцовых жыхароў, спісы супрацоўнікаў бібліятэчнага аддзела ГКБ, вучоных універсітэтаў Прыбалтыкі, вучоных, якіх трэба прыцягнуць да працы ў Беларускім навуковым таварыстве.

Дакументы медыцынскай тэматыцы прадстаўлены звесткамі аб супрацоўніках медыцынскіх устаноў: спісамі медыцынскіх работнікаў лякарняў, медыцынскіх работнікаў Барысаўскага, Валожынскага, Івянецкага раёнаў, супрацоўнікаў Беларускай палаты здароўя, медсясцёр з ліку мясцовага насельніцтва, працуючых у шпіталях; характарыстыкамі і аўтабіяграфіямі на ўрачоў, зубных урачоў; уліковымі карткамі, анкетамі і камандзіровачнымі прадпісаннямі медыцынскіх супрацоўнікаў з ліку мясцовага насельніцтва, накіраваных у Навагрудскую акругу, медыцынскіх работнікаў (урачоў, акушэрак, лабарантаў, медсясцёр, фармацэўтаў, дзэзынфектараў); спісамі, анкетамі аптэчных і фармацэўтычных супрацоўнікаў (у тым ліку Баранавіцкага акруговага камісарыята). Звесткі на хворых прадстаўлены карткамі аб інфекцыйных захворваннях (у тым ліку па г. Мінску і раёну), спісамі асоб, хворых на тыф, даведкамі часовай непрацаздольнасці з ліку мясцовага насельніцтва, даведкамі і пасведчаннямі на асоб, якія праходзілі лячэнне ў лазарэце СС г. Мінска.

Цікава, што ў фондах можна сустрэць біяграфічныя звесткі аб супрацоўніках акупацыйных устаноў суседніх краін. Яны прадстаўлены характарыстыкамі, аўтабіяграфіямі, заявамі, рэкамендацыйнымі лістамі на асоб, якія паступалі на службу ва ўстановы Украіны, Літвы, Эстоніі, спісам супрацоўнікаў Смаленскага гарадскога камісарыяту, анкетамі супрацоўнікаў Генеральных камісарыятаў Валыні, Падоліі і Украіны.

Сярод дакументаў захаваліся спісы выхаванцаў дзіцячых дамоў (Астрашыцка-Гарадоцкага, Браслаўскага, "Дразды", 2-га, 4-га, 8-га, 9-га Мінскіх, Полацкага, Ратамскага, Сёмкаўскага, Уздзенскага), а таксама дзяцей, якія пад час вайны згубілі бацькоў.

Звесткі аб ваеннапалонных прадстаўлены перапіскай з Барысаўскім акруговым камісарыятам аб вызваленні асобных военнапалонных з канцлагераў, спісамі вязняў канцлагера "Лясны", ваеннапалонных в. Струмен Струменскай сельскай абшчыны Кармянскага раёна, якія былі ў палоне ў г. Гомель, а таксама тых, якія пражывалі ў Паўловіцкай і Хлеўнянскай валасцях.

Інфармацыя аб грамадзянскім насельніцтве Беларусі змешчана ў шматлікіх спісах: сялян, якім патрэбны пропускі на выхад праз зону пастоў, габрэяў-рамеснікаў г. Мінска (люты 1942 г.), жыхароў населенных пунктаў, асоб, якія не заплацілі падаткі, саматужнікаў, грамадзян, якія былі пакараны за адмову ад выразкі і вывазкі дроў, сем'яў, чые родныя пайшлі ў партызанскія атрады, жыхароў вёсак, якія завербаваліся ў Германію, разрабаваных партызанамі грамадзян, дзяцей школьнага ўзросту, добраахвотнікаў з ліку савецкіх грамадзян, якія працавалі ў г. Поккінгу (Германія) на прадпрыемстве "Рорык-Бетрыб", землеўласнікаў і г.д.; заявамі, у якіх знайшлі адлюстраванне паўсядзённыя пытанні таго часу.

Матэрыялы судовых устаноў захоўваюць прысуды на служачых акупацыйных органаў і мясцовых жыхароў Беларусі, грамадзянскія справы Мінскага акруговага суда (аб зацвярджэнні тэстаментаў, маёмасных пытаннях, апецы над непаўналетнімі дзецьмі, разводзе, аліментах, узаконьванні дзяцей і інш.), перапіску аб судовых расследаваннях па справах арыштаваных асоб з мясцовага насельніцтва, заявы аб вызваленні арыштаваных. Асаблівасць апошніх заключаецца ў тым, што яны змяшчаюць некаторыя біяграфічныя звесткі.

Нешматлікімі, і тым больш цэннымі, з'яўляюцца запісы актаў грамадзянскага стану (ЗАГС) аб нараджэнні, шлюбе і смерці па Паўловіцкай воласці Кіраўскага раёна за некаторыя месяцы 1941–1943 гадоў. Акрамя таго, сярод спраў можна сустрэць дакументы органаў ЗАГС і за 1930-я гады.

Пэўную каштоўнасць маюць і матэрыялы перапісу жывёлы на 31 студзеня 1943 г., якія прадстаўлены па наступных раённых управах: Баранавіцкай, Браслаўскай, Вілейскай, Вязынскай, Гарадзішчанскай, Гарадоцкай, Глыбоцкай, Далгінаўскай, Дзісненскай, Докшыцкай, Дунілавіцкай, Жодзінскай, Залескай, Ільянскай, Клецкай, Крывіцкай, Ляхавіцкай, Маладзечанскай, Міёрскай, Мінскай, Мірскай, Мядзельскай, Нова-Мышскай, Нясвіжскай, Пастаўскай, Пліскай, Радашковіцкай, Стаўбцоўскай, Ходзінскай, Шаркаўшчынскай; Мінскай гарадской, Леанпольскай валасной управы Міёрскага раёна, Лучайскай валасной управы Пастаўскага раёна. Усяго налічваецца больш за 200 адзінак захоўвання. З гэтых спраў можна атрымаць звесткі пра гаспадара (прозвішча, імя) і адрас пражывання (для гарадоў з указаннем вуліцы), звесткі пра жывёлу.

У заключэнне варта адзначыць, што фонды нямецкіх акупацыйных устаноў змяшчаюць вялікую колькасць біяграфічных крыніц як аб мясцовым насельніцтве, так і аб грамадзянах замежных краін, якія супрацоўнічалі з акупацыйнымі ўладамі ці звярталіся да іх за вырашэннем пэўных пытанняў.

Дакументы ўтрымліваюць звесткі аб службе ў нямецкіх узброеных фарміраваннях, працы ў вышэйшых і мясцовых акупацыйных установах, узнагароджанні, выкладчыках і навучэнцах вышэйшых і сярэдніх навучальных установў, дзеячах навукі і культуры, супрацоўніках і пацыентах медыцынскіх установў, выхаванцах дзіцячых дамоў, ваеннапалонных, некаторых абставінах жыцця грамадзянскага насельніцтва і інш. У той жа час для ўвядзення гэтых дакументаў у навуковы ўжытак, неабходна больш дэталёвая іх распрацоўка і класіфікацыя (па храналагічнаму, геаграфічнаму і імянному крытэрыях падзелу).